74.58
И.29

# ИДЕОЛОГИЧЕСКАЯ РАБОТА И МЕРЫ ПО ЕЕ СОВЕРШЕНСТВОВАНИЮ

Тезисы докладов межвузовской
преподавательско-студенческой
научной конференции

УЧРЕЖДЕНИЯ ОБРАЗОВАНИЯ
«ПИНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ БАНКОВСКИЙ КОЛЛЕДЖ
НАЦИОНАЛЬНОГО БАНКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ»

«БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЭКОНОМИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# ИДЕОЛОГИЧЕСКАЯ РАБОТА И МЕРЫ ПО ЕЁ СОВЕРШЕНСТВОВАНИЮ

Тезисы докладов
межвузовской преподавательско-студенческой
научной конференции

Пинск, 25 мая 2006 г.

Пинск 2006

УДК 37+32+36(06)
ББК 74.58 + 66.0
Т 29 Тезисы докладов межвузовской преподавательско-студенческой научной конференции
И 29 Идеологическая работа и меры по её совершенствованию

Материалы печатаются в основном в том виде, в котором они были представлены авторами. Только в некоторых случаях они сокращены или подредактированы - там, где это было особенно необходимо.

Материалы печатаются по решению кафедры социально-гуманитарных дисциплин. Протокол. № 9 от 21.04.2006г.

*Ответственный за выпуск* **М.В. Цуба**

**Идеологическая** работа и меры по её совершенствованию: Тез: докл. межвуз. препод.-студен. научн. конф. Пинск, 25 мая 2006 г. 144 с.

СОДЕРЖАНИЕ

*Татаревич Валентина Федоровна* Идеологическое сопровождение воспитательной работы 5

*Макарушко Владимир Владимирович* Идеологическая работа и меры по ее совершенствованию 13

*Боричевская Валентина Васильевна* Информационная безопасность в сфере идеологической работы 17

*Игнатюк Елена Александровна* Эстетическая потребность: красота «формы» 20

*Можейко Павел Павлович* Христианство в современном мире 29

*Григорик Виктория Александровна* Конфессиональное состояние в г. Пинске (православие, католицизм) 37

*Гордич Анна Александровна* Конфессиональное состояние в г. Пинске (иудаизм, протестантизм) 42

*Ясинский С.А.* Спорт и идеология 46

*Фядзечка Сяргей Аляксеевіч* Фарміраванне ідэалогіі адносін да нацыянальных меншасцяў у II Рэчы Паспалітай 51

*Мисюковец Любовь Петровна* Социокультурная среда ВУЗа и её влияние на формирование личности студента 58

*Левченко А.Н.* Экономика и идеология 64

*Цуба Міхаіл Віктаравіч* Пачатак Першай сусветнай вайны і фарміраванне ідэалагічнай думкі на прыфрантавой паласе 69

*Гичун Д.И.* Партизанское движение в Беларуси. 86

*Шчэрба Галіна Аляксандраўна* Расійскі фактар і станаўленне беларускай дзяржаўнасці ў 20-я гады XX ст. 91

*Гагуа Руслан Борисович* Грюнвальдская битва в воспитании патриотизма при преподавании истории 99

*Грицкевич Татьяна Евгеньевна Шайковская Ольга Николаевна* Роль истории Отечества в формировании гражданской позиции современной молодежи 102

*Ковшик Татьяна Константиновна* Идеология как фактор развития белорусского общества на современном этапе 106

*Никитина Елена Васильевна* Идеология как основа формирования мировоззрения и гражданской позиции личности 111

*Евстафьев В.А.* Об эффективности идеологического влияния на молодежь 117

*Дмитриев Денис Андреевич* Идеология и проблемы молодежи 122

*Жилинский Павел Аркадьевич* Направление идейно-воспитательной работы в учебном заведении 126

*Петрушкевич Ольга Евгеньевна* Идеологическая работа в учреждениях образования 132

*Казакевіч Аляксандр Анатольевіч* Грамадска-палітычны рух на Беларусі ў пачатку XIX ст. 135

# ПАЧАТАК ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ І ФАРМІРАВАННЕ ІДЭАЛАГІЧНАЙ ДУМКІ НА ПРЫФРАНТАВОЙ ПАЛАСЕ

*М.В. Цуба*
*(ПДВБК)*

Хаця галоўнымі прычынамі першай сусветнай вайны былі эканамічныя супярэчнасці ваенна-палітычных блокаў Антанты і Траістага саюза, палітычныя разыходжанні і спрэчкі паміж імі, усё ж канкрэтнай падставай да вайны з'явілася драма, звязаная з нацыянальна-вызваленчым рухам славян супраць аўстра-венгерскага панавання. Пасля анэксіі Босніі і Герцагавіны Аўстра-Венгрыяй (1908г.), на тэрыторыі Босніі была створана арганізацыя "Чорная рука" кіраўніцтва якой ажыццяўляў былы палкоўнік сербскай

разведкі Апіса Дзмітрыевіч [1, с.2]. Галоўнай мэтай гэтай арганізацыі з'яўлялася стварэнне незалежнай дзяржавы ў выніку аб'яднання Сербіі і Босніі. Арганізацыя мела свае адгалінаванні ў выглядзе асобных баявых атрадаў: "Млада Босна", "Народна одбрана" і інш. у залежнасці ад мэт і спецыфікі выканання заданняў, а таксама ўзросту. За перыяд 1910-1914 гг. імі быў ажыццяўлены шэраг тэрарыстычных учынкаў супраць рознага рангу аўстра-венгерскіх чыноўнікаў на землях Босніі, якія былі анэксіраваны ў склад Аўстра-Венгрыі. Але асаблівую нянавісць у прадстаўнікоў нацыянальна-вызваленчага руху выклікалі члены імператарскай сям'і Аўстра-Венгрыі і асабіста эрцгерцаг Франц Фердынанд. План якога заключаўся ў прадастаўленні больш шырокіх правоў і магчымасцей славянскаму насельніцтву для актыўнага ўдзелу яго ў кіраўніцтве дзяржавай. Аднак такім накірункам дзейнасці Франца Фердынанда былі незадаволены ўсе: аўстрыйскія і венгерскія чыноўнікі не жадалі адмовіцца ад тых пераваг, якімі валодалі іх народы ў палітычнай структуры імперыі; у сваю чаргу лідэры славянскага нацыянальна-вызваленчага руху баяліся, што разладзяцца іх планы па стварэнню ўласнага паўднёва-славянскага каралеўства [2, с.1]

Пад канец чэрвеня 1914 года Аўстра-Венгрыя ў мэтах псіхалагічнага і ідэялагічнага ўздзеяння на Сербію, вырашыла правесці на баснійскай тэрыторыі побач з сербскай граніцай, ваенныя манёўры. Даведаўшыся, што 28 чэрвеня 1914 года на адкрыццё манёўраў у Сараева прыедзе нашчадак аўстра-венгерскага трону, кіраўніцтва "Чорнай рукі" паставіла задачу выкарыстаць зручны момант для замаху.

Франц Фердынанд каб падкрэсліць сяброўскі накірунак візіту прыхапіў у паездку сваю жонку Софію Хотэк. Ён загадаў, каб войскі былі аддалены падчас праезду, тым самым не мешалі свабоднаму доступу народа да яго асобы. Гэта было выкарыстана змоўшчыкамі. Падчас рухання картэжа ў машыну наследніка кідалі букеты кветак. У адным з іх прыляцела бомба, якая трапіла ў падол аддзеня Софіі Хотэк, адскочыла назад і ўзарвалася пад калёсамі наступнага аўтамабіля. Двое афіцэраў аховы былі паранены, а

кідальнік бомбы Нядзелька Чабрынавіч тут жа арыштаваны. Нягледзячы на інцыдэнт Франц Фердынанд працягнуў паездку да ратушы, дзе была праведзена тэрміновая нарада і прынята рашэнне аб змяненні маршрута выезду з горада. Аднак па дзіўнаму збегу абставін, шафёр эрцгерцага перапутаў маршрут, паехаўшы па старому шляху, дзе іх чакалі выканаўцы тэракта з “Млада Босны” – Гаўрыла Прынцып і Даніла Іліч. Першы з іх ўскочыўшы на падножку адкрытага аўтамабіля, выстраламі з рэвальвера застрэліў Франца Фердынанда і яго жонку [3, с.1]. Вядома, што арганізатары тэрарыстычнага акта Дзмітрыевіч і Іліч былі казнены. А непасрэдныя выканаўцы Прынцып і Чабрынавіч у сувязі з іх малалецтвам заключаны ў аўстрыйскую турму.

Так сараеўскія выстралы палажылі пачатак палітычнай і ваеннай актыўнасці ў Еўропе. Як паказала следства, сербскі урад не меў дачынення да дадзеннага тэракту, але быў асведамлёны, што замах рыхтуецца і сваечасова непрадухіліў яго. Здарэнне ў Сараева было выключна справай Аўстра-Венгрыі і Сербіі, аднак у гэту справу пачалі актыўна ўмешвацца Расія і Германія.

Амаль месяц аўстрыйскі ўрад на чале з імператарм Францам Іосіфам рыхтаваў адказ Сербіі. 23 ліпеня Аўстра-Венгрыя прад’явіла Сербіі фактычна непрымальныя для незалежнай дзяржавы ўльтыматыйныя патрабаванні з тэрмінам у 48 гадзін. Большасць з пунктаў ультыматума Сербія згадзілася выканаць. Выключэнне складалі ў гэтым плане 2 пункты: 1) допуск аўстрыйскіх следчых на сербскую тэрыторыю і 2) увядзенне на тэрыторыю краіны абмежаванага кантынгента аўстра-венгерскіх войск, што закранала суверэнітэт і нацыянальную годнасць праваслаўнай славянскай дзяржавы. Нягледзячы на тое, што асноўныя пункты ўльтыматума былі выкананы, раніцай 28 ліпеня 1914 года аўстра-венгерскі ўрад тэлеграмай аб’явіў вайну Сербіі. Высоўваючы версію аб славянскай пагрозе, кіруючыя колы Аўстра-Венгрыі з дапамогай вайны вырашылі стабілізаваць унутранае становішча ў імперыі і памяшаць Сербіі аб’яднаць вакол сябе суседнія славянскія народы.

На карысць вайны з Сербіяй, Аўстра-Венгрыі таксама ўказвала непадрыхтаванасць да яе сербскай заступніцы Расійскай імперыі і звышгатоўнасць Германіі падтрымаць сваю саюзніцу. Напрыклад, начальнік нямецкага ваеннага штабу Гельмут фон Мольтке запэўніў аўстра-венгерскі бок, што раней ці пазней, але еўрапейская вайна паміж тэўтонамі і славянамі павінна наступіць [4, с. 16]. 29 ліпеня адбылася бамбардзіроўка Белграда і іншых гарадоў Сербіі.

31 ліпеня Мікалай II аб'явіў усеагульную мабілізацыю. Германія неадкладна запатрабавала яе адмяніць. Аднак, патрабуючы ад урада Расійскай імперыі тэрміновай адмены усеагульнай мабілізацыі германскае кіраўніцтва не зрабіла ніякіх спроб паўплываць на ўтаймаванне ваяўнічых задум урада ў Вене, аб чым настойліва прасіў расійскі бок. Такі падыход рабіў прапанову Германіі для Расіі непрымальнай.

Атрымаўшы адказ, раніцай 1 жніўня 1914 года германскі пасол у Расіі граф Ф. Пурталес перадаў міністру замежных спраў С. Сазонаву ноту з аб'явай вайны. У гэты ж дзень Італія зрабіла аб'яву аб сваім нейтралітэце ў пачаўшымся ваенным канфлікце, тлумачачы, што ён пачаўся з-за агрэсіўных дзеянняў Аўстра-Венгрыі супраць Сербіі. А па-гэтаму не можа разглядацца як выпадак выканання саюзных абавязкаў для Італіі. 2-3 жніўня Францыя заявіла аб падтрымцы Расіі, а Англія аб падтрымцы Францыі. 6 жніўня Аўстра-Венгрыя аб'явіла вайну Расіі.

Яшчэ горш, чым ваенныя, паводзілі сябе прафесіянальныя палітыкі, якія прывыклі болей спадзявацца не на перамовы, а менавіта на ваенную сілу як на апошні аргумент палітычных спрэчак. Пажар вайны з кожным днём пашыраўся. Замест спроб патушыць яго, кіраўніцтва і дыпламатыя абедзвюх супрацьстаячых груповак імкнуліся ўцягнуць у ваенныя дзеянні на сваім баку, як мага болей краін свету. У той жа час тыя ж урады ваюючых дзяржаў у выступах на мітынгах і публікацыях прэсы стараліся пераканаць свае народы, што вайны яны не хацелі і рабілі ўсё магчымае, каб прадухіліць яе. Напрыклад, найбольшымі доказамі правядзення такой крывадушнай палітыкі

з боку Антанты з'яўляюцца тайныя дамоўленасці з Італіяй, якой абяцалася ў выпадку выступу на боку Англіі, Францыі і Расіі аддаць частку Сербіі, за "свабоду" якой пачалася вайна [5, с. 19]. Усе падобныя дагаворы і дамоўленасці вялікіх дзяржаў паказваюць, што яны развязалі бойню не за сапраўднае вызваленне сербаў, бельгійцаў і іншых малалікіх і "абіжаных" народаў Еўропы, а хутчэй за іх новае занявольванне. Да сённяшняга часу застаецца дыпламатычным сакрэтам пазіцыя, якую на пачатку вайны заняла Турцыя. Вядома, што на працягу ўсяго месяца жніўня 1914 года, турэцкія ўлады настойліва імкнуліся весці перамовы з царскім урадам аб сваім уступленні ў вайну на баку Расійскай імперыі [6, с . 245]. Аднак гэта пярэчыла ўсім планам і разбурала ўсе задумы царызма. Не дзіўна, што ўсе гэтыя спробы падманныя, а можа і не, былі перакрэслены расійскай дыпламатыяй. Не маючы Турцыю праціўнікам, нельга было адабраць у яе ні пралівы, ні Канстанцінопаль. Вайна стала еўрапейскай, а ў хуткім часе і сусветнай. У ваенных дзеяннях прынялі ўдзел 38 дзяржаў, у якіх пражывала звыш 1,5 млрд. чалавек, ці ¾ насельніцтва Зямлі.

Уступаючы ў Сусветную вайну, кожная з дзяржаў, праследвала свае захопніцкія мэты. Аўстра-Венгрыя разлічвала захапіць Сербію і Чарнагорыю, устанавіць свой уплыў на Балканах, забраць у Расіі частку польскіх зямель, Падолію і Валынь.

Турцыя пры падтрымцы Германіі прытэндавала на тэрыторыю рускага Закаўказзя.

Англія імкнулася захаваць сваю марскую і каланіяльную магутнасць, разграміць Германію як галоўнага канкурэнта на сусветным рынку і спыніць яе дамаганні на падзел калоній.

Францыя не толькі хацела вярнуць Эльзас і Латарынгію, але і захапіць багаты Саарскі басейн.

Расія, уступаючы ў вайну з Германіяй, Аўстра-Венгрыяй і Турцыяй нясе не меншую адказнасць за яе развязванне. Больш за стагоддзе Расійская імперыя галоўную сваю экспансію праводзіла ў накірунку паўднёва-ўсходняй

Еўропы, называючы гэта сваёй гістарычнай місіяй. На самой справе пад лозунгам "абароны праваслаўя" яна дамагалася свабоднага выхаду свайго флота праз Басфор і Дарданеллы ў воды Міжземнага мора, каб затым на Балканскім паўвостраве "вызваліць" славянскія народы з-пад аўстра-венгерскага і турэцкага прыгнёту і ўзяць іх пад сваю апеку. Акрамя таго імкнулася далучыць да сваёй тэрыторыі землі Галіцыі і ніжняга Нёмана.

Захопніцкія мэты Германіі ў значнай ступені закраналі і беларускія землі. Германія імкнулася не толькі разграміць Англію, Францыю, але ж і моцна паслабіць Расійскую імперыю адняўшы ў яе Беларусь, Украіну і Прыбалтыку. Напрыклад, ужо 6 жніўня 1914 года германскі канцлер Г. фон Бетман-Гольвег заявіў, што яго краіна жадае "вызваліць прыгнечаныя народы Расіі і адцясніць рускі імперыялізм да маскоўскіх межаў" [7, с.1]. Больш акрэслена ў гэтым накірунку выступіла нацыяналістычная арганізацыя Пангерманскі саюз. У праграме дадзенай арганізацыі падрыхтаванай 28 жніўня 1914 года, пазначана аб неабходнасці аддзялення ад Расіі зямель Польшчы, Ліфляндыі, Курляндыі, Літвы, Беларусі і Украіны. Вядомы дзеяч Пангерманскага саюза, прафесар Ф. Лецiус прапанаваў перанесці граніцы Расіі ад Балтыйскага мора да межаў Волхава і Дняпра, а пагранічнымі гарадамі Германіі на ўсходзе зрабіць Вялікі Ноўгарад і Магілёў [8, с.1]. Аднак пераважная большасць нямецкіх палітыкаў, прадпрымальнікаў, ваенных і прадстаўнікоў інтэлігенцыі на пачатку вайны лічылі, што Германія павінна аддзяліць ад Расійскай імперыі польскія і прыбалтыйскія землі, а таксама "рускую Польшчу" (г. зн. заходнебеларускія землі). Гэтыя тэрыторыі меркавалася ператварыць у своеасаблівы буфер, які б абараняў усходнія землі рэйха ад магчымых нападкаў з боку рускіх войск. Астатнія землі, якія магчыма будуць заваяваныя на Усходзе, па іх меркаванню, патрэбна было выкарыстаць у якасці "разменнай карты" падчас дыпламатычных перамоваў з Расіяй у выпадку згоды яе кіраўніцтва на заключэнне сепаратнага міру [9, с.2].

Амаль ва ўсіх дзяржавах пачатак “Вялікай вайны” быў сустрэты з уздымам і энтузіязмам. Не стала выключэннем і Расійская імперыя.

Ужо ў першы дзень вайны была пераіменавана сталіца расійскай дзяржавы. Санкт-Пецярбург страціў сваю нямецкую назву і стаў Петраградам. 2 жніўня вялізарныя натоўпы народа віталі Мікалая II на дварцовай плошчы сталіцы. У гэты дзень імператар пакляўся на Евангеллі і святой іконе, што не падпіша міра, пакуль хоць адзін вораг застанецца на рускай зямлі. Вядома, што тысячы людзей – прадстаўнікоў усіх слаёў грамадства, у адзіным парыве стоячы на каленях перад Мікалаем II спявалі гімн “Божа цара храні”.

Такія ж настроі панавалі і ў Дзяржаўнай думе. Дэпутаты амаль адзінагалосна (за выключэннем сацыял-дэмакратаў) прынялі рашэнне аб крэдытах на ваенныя патрэбы.

Рабочыя па ўсёй краіне спынілі забастоўкі і першыя мабілізацыйныя наборы прайшлі ў поўным парадку. Народныя настроі ў тыя дні набылі яўную антынямецкую накіраванасць. Дэманстранты разграмілі германскую амбасадару. Гарэлі падпаленыя гуртам будынкі нямецкіх фірм. Пражываючым у Расійскай імперыі ў тым ліку на беларускіх землях немцам і іх сем’ям з першых дзён вайны прыйшлося выцярпець нямала зняваг і іншых праяў варожасці.

Увогуле, пачатак вайны аказаў значны ўплыў на стан грамадска-палітычнага жыцця на Беларусі, у першую чаргу на пазіцыі розных палітычных партый, арганізацый груповак. Ліберальныя і манархічныя партыі падтрымалі вайну і царскі ўрад, выступіўшы з лозунгам “абароны айчыны”.

Правыя эсэры фактычна таксама выступілі на баку царскага ўрада з вядомым заклікам “Спачатку перамога – потым рэвалюцыя”. Больш таго на пачатку вайны імі быў утвораны, так званы, Ваенна-рэвалюцыйны саюз, які сканцэнтраваў свае намаганні на рабоце ў арганізацыях заходніх (беларускіх)

губерняў, што абслугоўвалі фронт. Вядома, што ВРС заклікаў устрымацца ад друкавання і распаўсюджвання рэвалюцыйных пракламацый і г. д. [10, с.238]

Але былі і такія партыі, якія праігнаравалі зварот да іх цара, дзе Мікалай II заклікаў усе палітычныя сілы дзяржавы да аб'яднання ў грозны час, каб "забыўшы ўнутраныя спрэчкі спыніць дзерскі націск ворага" [11].

Бальшавікі і леваэсараўская плынь лічылі, што трэба працягваць рэвалюцыйную барацьбу і жадалі паражэння ў вайне царскаму ўраду.

Антываенную пазіцыю заняла рэдакцыя газеты "Наша ніва", фактычна ядро партыі БСГ. На старонках газеты ў межах магчымага асвятлялася, што вайна вядзецца не ў інтарэсах народа.

Але даволі значная частка беларускай інтэлігенцыі лічыла неабходным апраўдваць вайну ў больш узвышаным сэнсе, шукаючы кампрамісу паміж пацыфісцкімі перакананнямі і сумнай рэчаіснасцю. У гэтых спробах прымірыць апраўданне масавага забойства з голасам чалавечай сумленнасці нельга было не прыняць асноўнай ідэі. Так з'явіліся і шырока распаўсюдзіліся ў гэты час такія лозунгі, як "вайна супраць вайны", "апошняя вайна на свеце", "вайна без пераможцаў і пераможных", "вайна за мір" – і асабліва прымальны і зразумелы заклік: "вайна за незалежнасць малых народнасцяў". Менавіта гэты заклік з цягам часу атрымае выразнае ўвасабленне ў грамадска-палітычным жыцці на нашых землях і прывядзе да спроб стварэння сваёй дзяржаўнасці.

У імператарскім маніфесце па выпадку вайны ад 2 жніўня 1914 года, копіі якога былі аддрукаваны ў губернскіх тыпаграфіях і разасланы па ўсіх гарадскіх, павятовых установах і цэрквах беларускіх губерняў паведамлялася: "Трымаючыся гістарычных сваіх заветаў, Расія, адзіная па веры і крыві з славянскімі народамі, ніколі не глядзела на іх лёс безудзельна". Далей высвятляючы абставіны аб'яўлення вайны Германіяй Расіі ў маніфесце напісана: "... саюзная Аўстрыі Германія, насуперак нашым надзеям на векавое добрае суседства і не слухаючы завярэння нашага, што прынятыя меры (г. зн. Прывядзенне арміі і флота у ваеннае становішча) зусім

не маюць варожых ёй мэтаў, стала дамагацца неадкладнай іх адмены і, сустрэўшы адказ у гэтым патрабаванні, нечакана аб'явіла Расіі вайну" [12]. Патрэбна адзначыць, што перад гэтым напад Аўстра-Венгрыі на Сербію з'яўляўся ўсяго штуршком да пачатку сусветнага пажару, бо на карце стаялі рэальныя інтарэсы ў першую чаргу вялікіх дзяржаў, у тым ліку і Расіі. Але яе заклік на абарону праў маленькага славянскага народа не мог не імпанаваць і ў значнай часткі беларускага грамадства. Да таго ж ініцыятыва развязвання вайны належала Германіі, а самое ўручэнне ноты аб гэтым германскім паслом у Расіі Пурталесам (які з-за хвалявання перадаў дадзеную ноту С.Д. Сазонаву падрыхтаваную у 2-х экзэмплярах, дзе ў любым выпадку, нават, калі б Расія спыніла мабілізацыю, прадугледжвалася аб'ява ёй вайны) выклікала справядлівае абурэнне сярод насельніцтва Расійскай імперыі.

Паводле афіцыйнай прапаганды вайна лічылася справядлівай, нават "Вялікая Айчыннай", практыкавалася ўздзеянне на свядомасць грамадзян з дапамогай кінахронікі, прэсы, высоўваўся тэзіс, што гэта "вызваленчая вайна для ўсяго заходняга і паўднёвага славянства". Насельніцтва заклікалася ўсімі магчымымі сродкамі аказваць падтрымку і неабходную дапамогу ў мэтах дасягнення хутчэйшай перамогі над ворагам.

У распаўсюджаным па Мінску вазванні падкрэслівалася, што "Для Расіі наступілі цяжкія дні. Мільёны верных яе сыноў гатовы абараняць сваімі грудзьмі Айчыну і ахвяраваць радзі яе жыццём. У такі час кожны, хто любіць Радзіму павінен думаць толькі аб тым, як дапамагчы Дзяржаўнаму манарху і яго доблеснай арміі ў барацьбе з ворагам" [13].

У гэтай сувязі становіцца зразумелай тая атмасфера патрыятычнага энтузіязму, ахапіўшая слаі грамадкасці Расійскай імперыі пасля прад'яўлення германскага ўльтыматума і затым паследаваўшай аб'явы вайны.

Напрыклад, газета "Северо-западная жизнь» паведамляла, што ўжо 31 ліпеня 1914 года ў Мінску група навучэнцаў з заклікам: "Далой Аўстрыю!", "Няхай жыве Расія і Сербія!" прайшла па вуліцы да дома губернатара і ўручыла адрас на імя цара. З прычыны гэтага каля рэзідэнцыі губернатара

сабралася да 500 грамадзян [14, с.1]. Аб падтрымцы палітыкі царскага ўраду ў дачыненні да вайны насельніцтвам Магілёва паведамляецца ў "Могилёвском вестнике", дзе адзначалася небывалае ажыўленне ... асобы патрыятычны пад'ём" на сходах прадвадзіцеляў дваранства, членаў губернскага земства, духавенства, ганаровых грамадзян, настаўнікаў, што праходзілі з 2 жніўня 1914 года ў Магілёве [15]. 12 жніўня 1914 года адбылася 5-ці тысячная маніфестацыя ў падтрымку "цара і айчыны" у Пінску, у якой прынялі ўдзел розныя слаі гарадскога насельніцтва [16, с.72]. Падобныя маніфестацыі на пачатку вайны мелі месца таксама і ў іншых гарадах і сяленнях Беларусі.

Падаграваліся яны яшчэ паспяховым наступленнем ва Ўсходняй Прусіі рускіх армій пад камандаваннем генералаў Паўла Рэненкампфа і Аляксандра Самсонава. Будучы ў прыфрантавой паласе беларускія землі з'яўляліся своеасаблівым індыкатарам настрояў мас падчас перамог і паражэнняў, што моцна ўплывала на грамадскую думку.

Пасля атрыманай перамогі 7 жніўня 1914 года пад Гумбіненам арміяй Рэненкампфа, у войсках раскватэраваных у заходніх губернях, а таксама сярод насельніцтва хадзілі размовы, што Рэненкампф праз 2 – 3 месяцы авалодае сталіцай Германіі – Берлінам. Аднак пераможны марш аказаўся нядоўгім і хутка змяніўся цяжкімі паражэннямі. Рэшткі разбітых рускіх армій, якія некалі лічыліся галоўнай апорай царскага трону ў беспарадку, невялікімі групоўкамі адыходзілі ў раён Гродна. Менавіта, паражэнні ва Усходняй Прусіі значна астудзілі панаваўшы дагэтуль патрыятычны ўздым, выкліканы пачаткам вайны і нават давялі да страху, абурэння і непакою.

Паўсюдна хадзілі чуткі аб прадажніцтве і здрадзе. Яшчэ больш узмацнілася варожасць да людзей нямецкага паходжання, пражываючых на Беларусі. Напрыклад, вядомы генерал першай сусветнай вайны Ю.Н. Данілаў, які ваяваў на Заходнім фронце пісаў, у гэты час наступнае, што супраць асоб нямецкага паходжання і замежных грамадзян увогуле мелі месца пагромы. Прычына якіх "раздражэнне насельніцтва супраць немцаў.

Яны нас б'юць на фронце, а мы іх у тылу. Узрыў патрыятызму. Пачварнага, агіднага быць можа, але ўсё ж патрыятызму!" [17, с.81]. Паміж іншым у спісах рускага генералітэта значылася 10% асобаў германскага паходжання з ліку абрусеўшых немцаў. Тады ў іх, ды і ў іншых людзях з нямецкім прозвішчам бачылі магчымых шпіёнаў. Шматлікія справы аб ваенным шпіянажы былі заведзены ў гэты час [18]. Акрамя таго мноства нямецкіх каланістаў з беларускіх губерняў было вывезена па чыгунцы, за асабістыя грошы, пад канвоем паліцэйскіх стражнікаў у глыб Расійскай імперыі [19].

На старонках большасці газет, што выдаваліся на беларускіх губернях у гэты час актыўна прапаведваўся лозунг аб'яднання ўсіх слаёў грамадства вакол самадзяржаў'я, прапагандаваліся ідэі грамадзянскай згоды ў імя абароны айчыны, былі частымі заклікі да ахвяр на карысць перамогі, а таксама прадказваўся блізкі поспех славянскай зброі, абмяркоўваліся мэты і задачы вайны. Напрыклад, губернская газета "Могилёвский вестник" у гэты час пісала: "Што, калі будзе вырашана пытанне аб нашых і славянскіх адносінах да Нямеччыны, то гэта не будзе азначаць канец спрэчкам..., калі мы і сёння не выйдзем на прастор у Чорным моры, і калі на Святой Сафіі не заззяе новай славай хрысціянскі крыж, мы не можам лічыць, што наша справа даведзена да канца" [20].

З падобнымі заклікамі выступалі і праваслаўныя святары, аб чым сведчыць зварот праваслаўнай царквы да воінаў, які распаўсюджваўся на Беларусі і сярод грамадзянскага насельніцтва. У ім гаворыцца што "яшчэ ніколі так не аб'ядноўваліся ў нас цар, правадыры і народ, як у сённяшні час. Цяпер ва ўсіх, ад цара да прасталюдзіна толькі адна думка і адзінае жаданне: давесці вайну да пераможнага канца, канчаткова зламаць нахабнага ворага і гэтым надоўга забяспечыць мір і сабе, і ўсяму свету" [21].

Патрыятычна-шавіністычная хваля выступленняў у падтрымку вайны захліснула і значную частку працоўнага люду. Але пераважная большасць рабочых, сялян, частка інтэлігенцыі былі супраць палітыкі вайны. У адрозненні ад Германіі, дзе вайна лічылася нейкім звышчалавечым яўленнем,

узвышаючым дух, сілу народа і Расіі, у глыбінях якой панавала цішыня па прынцыпу: "Мы далёка, да нас Вільгельм не дойдзе", адносіны беларускага грамадства да вайны, дзе ваенны подых выразна адчуваўся з самага яе пачатку ні да адной з гэтых крайнасцяў не падыходзілі.

Ужо ў першыя дні вайны ў заходніх, у тым ліку і ва ўсіх беларускіх *губернях, якія з'яўляліся прыфрантавой* паласой расійскага Паўночна-Заходняга фронта было ўведзена ваеннае становішча. У сувязі з гэтым уся паўната ўлады перадавалася ў дадзеных месцах у рукі ваенных. А спецыяльныя пастановы выдадзеныя ў гэты час падкрэслівалі, што ўсе асобы, у тым ліку і грамадзянскае насельніцтва, "падлягаюць ваеннаму суду і пакаранню па законах ваеннага часу аж да смяротнай казні: 1) за бунт супраць вярхоўнай улады 2) за наўмысны падпал..." і г.д. [22] Акрамя таго, прысланы ў Мінск цыркуляр міністра ўнутраных спраў М.А. Маклакава патрабаваў ад мінскага губернатара "самым уважлівым вобразам ставіцца да настрояў насельніцтва і да ўсіх праяў грамадкасці. Для падтрымання поўнага парадку, так неабходнага ў час вайны, - працягваў М.А. Маклакаў, - прашу не дапускаць ніякіх дэманстратыўных шэсцяў... . Усялякія беспарадкі павінны быць спынены у самым пачатку, а гурты рассейваемы. У выпадках малейшага супраціўлення натоўпа патрэбна рашуча прымаць крайнія меры аж да прымянення, згодна існуючым правілам, зброі" [23].

Вялікая ўвага прыдавалася барацьбе супраць забастовачнага і рэвалюцыйнага руху. Спецыяльныя пастановы дадзенага характару камандуючы Мінскай ваеннай акругі дасылаў мінскаму губернатару ўжо 8 жніўня 1914 года [24]. Асабліва строгія меры прымаліся, каб папярэдзіць забастоўкі на чыгунках. Для гэтага на чыгуначных вузлах прыфрантавых губерняў былі створаны Камітэты надзвычайнай аховы. У сваю чаргу ў жніўні 1914 г. мінскі губернатар загадваў земскаму кіраўніцтву мінскай губерні расклейваць на відных месцах, а таксама вусна тлумачыць змест на вясковых сходах патрыятычных лістовак, дасланых з штаба арміі. Лістоўкі былі адрасаваны вясковаму насельніцтву з мэтай захавання спакою ў

сельскай мясцовасці і прыцягвання сялян да звычайных восеньскіх палявых работ. У іх пісалася, што "ніякага стаптвання палей варожым войскам не будзе, так як баі будуць адбывацца не на рускай, а на нямецкай зямлі. Сяляне не павінны верыць усялякім бессэнсоўным слухам. Уся зямля руская паднялася, як адзін чалавек, за справядлівую справу і нашы багатыры не аддадуць ворагу ні адзінай пядзі рускай зямлі" [25].

У той жа час урадавыя сродкі інфармацыі пачалі ў многіх выпадках штучна раздуваць антынямецкія настроі. У немалай ступені гэтаму садзейнічаў і Ўказ Мікалая II "Аб правілах, якімі Расія будзе кіравацца ў перыяд вайны" ад 2 жніўня 1914г., дзе загадвалася: "Затрымаць падданых непрыяцельскіх дзяржаў, як састаячых на вайсковай службе, так і падлежачых прызыву, у якасці ваенапалонных" [26]. Але мясцовыя ўлады пайшлі яшчэ далей. У выніку на некаторых прадпрыемствах адбываліся звальненні пражываючых на Беларусі немцаў і нават суды (у прыватнасці на землях Мазырскага павета) па справе нямецкіх каланістаў [27].

22 жніўня 1914 года Мікалай II прыняў рашэнне аб увядзенні поўнага "сухога закону". Вайну, якую часта называлі ў друку "Свяшчэннай" патрэбна было весці, па меркаванню імператара, цвярозай нацыі. Паколькі перамога планавалася праз пару месяцаў, то вялікай трагедыі ў дадзенным устрыманні не наглядалася. Адпаведныя меры адразу былі ўведзены на прыфрантавой паласе. Каб навесці парадак і прадухіліць масавае п'янства ў вайсковых фарміраваннях Паўночна-Заходняга фронту, якое прыняла значныя памеры на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю, камандуючы гэтага фронту ў распараджэнні ад 8 кастрычніка 1914 года загадваў "... у далейшым, без майго асобага дазволу вінных лавак не адчыняць" [28]. Хто не падпарадкоўваўся з мясцовых жыхароў дадзенаму загаду аддавалі пад суд.

Адразу пад строгі кантроль уладамі быў узяты перыядычны друк і культурныя ўстановы. Насельніцтву забараняўся тут усялякі продаж газет і кніг без дазволу вайсковага начальства [29, с.596]. Змест перыядычнага друку павінна была вызначаць папярэдняя ваенная цэнзура, якая зачастую здымала

з выдання шматлікія публіцыстычныя артыкулы, у выніку газеты нярэдка выходзілі з белымі плямамі. Непадпарадкаванне ўведзеным цэнзурным правілам строга каралася. Напрыклад, ужо на пачатку вайны па ўказанию ўрадавага Сената "утрымальнік тыпаграфіі або тыпаграфскіх устаноў, ці кіруючы гэтым, вінаваты ў друкаванні артыкула, без дазволенага подпісу ваеннай цэнзуры, альбо ў сувязі з заменай таго зместу, што дазволіла ваенная цэнзура", падвяргаўся грашоваму спагнанню ад 25 да 3000 рублёў ці заключэнню ў турму ад 2 тыдняў да 3 месяцаў [30].

Газеты, якія ўяўлялі хоць нейкую апазіцыю ўраду ("Отклики" – Гомель, "Наша ніва", "Вечерняя газета", "Беларус" – Вільня), падвяргаліся судовым спагнанням і нападкам у час якіх канфіскоўваліся асобныя нумары, часта выходзілі з перапынкамі.

Разам з вядомымі афіцыйнымі газетамі "Виленским, Могилёвским, Оршанским вестниками", "Бобруйским курьером" і інш., у сувязі з ваеннымі падзеямі, у многіх прыфрантавых павятовых гарадах Беларусі пачалі выходзіць своеасаблівыя мясцовыя газеты пад назвай "Телеграммы Петроградского телеграфного агенства" (Ашмяны, Барысаў, Ігумень, Клецак, Лунінец, Ляхавічы, Нясвіж, Навагрудак, Рэчыца, Слуцк) [31, с.186].

Адначасова забаранялася, або значна абмяжоўвалася праца большасці культурных устаноў. Так, згодна з распараджэннем галоўнага начальніка Мінскай ваеннай акругі ад 15 сакавіка 1915г. барона Рауша-фон-Траўбенберга "усялякага рода гульні, відовішчы і вяселлі ва ўсіх клубах і грамадскіх сходах павінны былі заканчвацца не пазней двух гадзін ночы", калі ж дзе адбывалася парушэнне дадзенага загаду, то тая ўстанова адразу закрывалася [32]. Пад забаронай аказаўся і прагляд начных сеансаў кіно ў Вільні. Апраўдваючы гэтае рашэнне ўлад "Виленский вестник", піша: "Мы, зрэшты, не бачылі б ніякай бяды нават у тым выпадку, калі б усе кінематографы летам у нас былі зачынены... . Варта б, мець на ўвазе, што ваенны час – асобны час: час самапаглыблення, устрымання, словам – час агульнага не толькі ратнага, але і духоўнага подзвігу" [33, с.3]. Згодна з

артыкулам 12, § 61 – пастановы аб мясцовасцях, якія знаходзяцца на ваенным становішчы, тут нават прызнавалася «непажаданым правядзенне якіх бы то ні было лекцый і паведамленняў публічнага характару, без дазволу галоўнага начальніка ваеннай акругі" [34]. Акрамя таго начальнік штаба ваеннай акругі, даводзіў сваёй інструкцыяй да цывільнага кіраўніцтва Мінскай губерні наступнае: "У выпадках выяўлення нелегальнай літаратуры альбо твораў тэндэнцыйнага характару, неадкладна патрэбна затрымліваць кнігі і брашуры такога зместу і дастаўляць іх у давераны мне штаб" [35].

З другога боку, даволі шырока заахвочвалася царскімі ўладамі заснаванне "таварыстваў дапамогі пацярпелым ад вайны" і адкрыццё мясцовых аддзелаў Чырвонага Крыжа. Менавіта гэтым арганізацыям у першую чаргу перадаваліся будынкі гімназій, вучыльняў, іншых навукова-вучэбных установ, адпаведна загаду ваеннага ведамства ад 26 жніўня 1914 года [36]. У вазванні Мінскага аддзела Чырвонага Крыжа паведамлялася, што "мясцовы аддзел вырашыў арганізаваць самую шырокую медыцынскую дапамогу войскам... . Акрамя таго, аддзел адкрыў цэнтральны склад Чырвонага Крыжа для прыёму ахвяраванняў на карысць нашых воінаў" [37]. Да дадзенага вазвання далучыўся і епіскап Мінска-Тураўскі Мітрафан, які напачатку 1915 года заклікаў духавенства і паству "з ахвотай і радасцю несці свае ахвяраванні на справу добрапрыстойную і святую" [38]. У гэтым жа вазванні паведамляецца, што "Князь Радзівіл прыняў прапанову адкрыць у сваім замку ў Нясвіжы для надабнасцяў Чырвонага Крыжа лазарэт з усім наяўным абсталяваннем і медыцынскім персаналам" [39].

Увогуле ж пачатак першай сусветнай вайны змяніў і абвастрыў грамадска-палітычныя абставіны на беларускіх губернях. Увядзенне ваеннага становішча зрабіла моцны адбітак на абліччы беларускіх гарадоў і вёсак. Тут размясціліся штаб вярхоўнага галоўнакамандуючага (Баранавічы), штаб фронту (Мінск), якім належала рэальная ўлада, а таксама розныя паўваенныя ўстановы грамадскіх арганізацый па абслугоўванню вайскоўцаў. У выніку грамадска-палітычнае жыццё абмяжоўвалася ўмовамі ваеннага часу.

Пераважная большасць насельніцтва на нашых землях з увядзеннем ваеннага становішча адчула жорсткі паліцэйскі рэжым і не мела магчымасці адкрыта змагацца за паляпшэнне сваёй долі, альбо хаця б выказваць свае палітычныя погляды без рызыкі быць пакаранымі.

Літаратура:


1. http://www.vechny.com/history/hs0402_1.htm
2. file://c:\Documents and Settings\cub...\Первоя мировая война и Россия. Сорокина. ht
3. http://defacto.examen.ru/db/Examine Base/catdoc_id/5323FF2D1F5D543.../defacto.htm
4. Весялкоўскі Юры. Беларусь у Першай Сусветнай вайне (Гістарычны нарыс), Беласток-Лёндан, 1996. – 361 с.
5. Там жа.
6. Заговор графа Милорадовича /В.А. Брюханов. – М.: ООО «Изд-во АСТ»: ООО «Изд-во Астрель», ЗАО НПП «Ермак», 2004. – 415 с.
7. Цит://www/cenunst.bsu.by/journal/2002.4/tikhomirov.shtml
8. Цит://www/cenunst.bsu.by/journal/2002.4/tikhomirov.shtml
9. Цит://www/cenunst.bsu.by/journal/2002.4/tikhomirov.shtml
10. Гісторыя Беларусі. У 2ч. Ч.2 XIX – XX ст.: Курс лекцый / П.І. Брыгадзін, У.Ф. Ладысеў, П.І. Зялінскі і інш. – Мн.: РІВШ БДУ, 2002. – 656с.
11. НАРБ. Ф. 1416, воп. 1, с. 2350, л. 2
12. НАРБ. Ф. 1416, воп. 1, с. 2350, л. 2
13. НАРБ. Ф. 295, воп. 1, с. 8938 ч. II, л.16
14. Передовица // Северо-западная жизнь. – 1914. – 29 июля.
15. Передовые статьи // Могилёвский вестник. – 1914. – 22, 29 июля.
16. *Лапинский Л.П.* Крестьянское движение в Белоруссии в 1914 – 1917 гг. – Минск: Изд-во БГУ, 1975. – 184 с.
17. ДА Мінскай вобл., ф. 295, с. 10806, л.368.

18. НАРБ. Ф. 705, воп. 1, с. 75, 75, 77, 77.
19. НАРБ. Ф. 295, воп. 1, с. 8982, л. 1, 2, 6, 11, 16, 17, 20.
20. Передовая статья // Могилёвский вестник – 1914. 29 октября.
21. НАРБ. Ф. 295, воп. 1, с. 8642, л. 98.
22. НАРБ. Ф. 705, воп. 1, с. 27, л. 59.
23. НАРБ. Ф. 295, воп. 1, с. 8600, л. 546.
24. НАРБ. Ф 295, воп. 1, с. 8591б ч. III, л. 245.
25. НАРБ. Ф. 295, воп. 1, с. 8591б ч. III, л. 231.
26. НАРБ. Ф. 295, воп. 1, с. 8591б, л. 283.
27. НАРБ. Ф. 705, воп. 1, с. 15, л. 193.
28. НАРБ. Ф. 295, воп. 1, с. 8591б ч. III, л. 246.
29. Гісторыя Беларускай ССР у 5 т. Т.2. Указ. сач.
30. НАРБ. Ф. 1416, воп. 1, с. 2355, л. 4.
31. Александровіч С.Х. Пуцявіны роднага слова. Указ. сач.
32. НАРБ. Ф. 295, воп. 1, с. 8642, л. 104.
33. В.Ю. Домогательства виленских кинематографов // Виленский вестник. – 1915. – 3 апреля.
34. НАРБ. Ф. 295, воп. 1, с. 9187, л. 476.
35. НАРБ. Ф. 295, воп. 1, с. 8601а ч. I, л. 13.
36. НАРБ. Ф. 295, воп. 1, с. 8938, л. 28, 32, 33.
37. НАРБ. Ф. 295, воп. 1, с. 8938, л. 16.
38. НАРБ. Ф. 295, воп. 1, с. 8642, л. 36.
39. НАРБ. Ф. 295, воп. 1, с. 8938, л.2.